# Сведка Паўночнай вайны: скарб з вёскі Каралёў Стан Мінскага раёна

**Віталь СІДАРОВІЧ**



Дзяржаўная ўстанова «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: wital.sidarowicz@gmail.com

**Людміла ТАЛКАЧОВА**



Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц, кандыдат мастацтвазнаўства, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: gwendolin@yandex.by

У кастрычніку 1978 г. у вёсцы Каралёў Стан Мінскага раёна падчас капання бульбы на глыбіні каля 40 см быў знойдзены скарб буйных срэбных манет. Жыхар гэтай вёскі Мікалай Паўлавіч Салдаценка перадаў у Дзяржаўны музей БССР (сучасны Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) 149 манет, за «збор і дастаўку» якіх яму было выплачана 120 рублёў[1]. На жаль, у музейнай дакументацыі не захавалася звестак аб тары, якая магла суправаджаць знаходку.

Вёска Каралёў Стан мае гучную назву, якая выклікала з’яўленне падання аб тым, што ў 1514 г. тут спыняўся са сваім войскам вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт I Стары (1506–1548) падчас вайны з Вялікім Княствам Маскоўскім. Насамрэч гістарычна гэты факт не зафіксаваны, аднак вядома, што Каралёў Стан адносіўся да маёнтка Волма (інакш Драчкава) Мінскага ваяводства. Уладальнікам гэтых зямель у сярэдзіне XVII ст. быў князь Багуслаў Радзівіл – прадстаўнік біржанскай галіны гэтага магнацкага роду. У 1652 г. Багуслаў Радзівіл перадаў маёнтак Марціну Каштэлі ў застаўнае валоданне за 50 тысяч злотых [1, арк. 1а–2]. На працягу 26 гадоў маёнтак Волма бесперапынна знаходзіўся ў застаўным трыманні спачатку Марціна Каштэлі, а потым яго сына смаленскага чашніка Марціна Станіслава. У 1678 г. Марцін Станіслаў і яго жонка Ганна з Рачыцкіх Каштэль перадалі правы на застаўны маёнтак Волма Яну Рафалу Кастравіцкаму [1, арк. 9–10 адв.]. У 1690 г. пфальцграфіня нойбургская княгіня Людвіка Караліна Радзівіл пацвердзіла трыманне Я.Р. Кастравіцкага [1, арк. 14–19 адв.; 2, арк. 139 адв.]. Ян Рафал Кастравіцкі, верагодна, памёр у 1695 г., бо яго тастамент датуецца 14 студзеня 1695 г. [3, арк. 51 адв. – 52]. Спадкаемцам і наступным трымальнікам Волмы стаў сын Яна Рафала Антоні Кастравіцкі. Кастравіцкія трымалі маёнтак да сярэдзіны 1730-х гг.[2].

На жаль, гісторыя скарбу з Каралёва Стана мае сумны працяг. З пачаткам «эры металадэтэктараў» шмат месцаў знаходак скарбаў падверглася бязлітаснаму «абследаванню» з боку скарбашукальнікаў. Падобнае здарылася і з вышэйзгаданым дэпазітам. Прыкладна ў 1990-я гг. нейкі «аматар» знайшоў частку гэтага скарбу, якая не была раскапана пры першасным выяўленні ў 1978 г. Колькасць знойдзеных пры гэтым манет невядомая, але можна казаць пра дзясяткі манет, сярод якіх дакладна былі талерныя. Усе наваснойдзеныя манеты разышліся па прыватных калекцыях, у тым ліку за межамі Беларусі. Таму можна толькі здагадвацца аб рэальнай колькасці манет у скарбе з Каралёва Стана, а ў дадзеным артыкуле прыводзіць статыстыку толькі па манетах з музейнага збору.

Першасная атрыбуцыя манет, якія паступілі ў збор Дзяржаўнага музея БССР, была праведзена

*[1] Акт прыёму № 5837 ад 24 лістапада 1978 г.*

*[2] Выказваем шчырую падзяку Яўгену Глінскаму і Мікалаю Волкаву за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула.*



*Скарб з вёскі Каралёў Стан на выставе «Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля» ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (2016–2020)*

***Малюнак 1***

навуковым супрацоўнікам Л.Д. Клокам. Аўтарамі артыкула ў межах сістэматычнай працы па навуковай апрацоўцы скарбаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь было праведзена ўдакладненне атрыбуцыі і падрыхтавана статыстыка гэтага цікавага і атрактыўнага комплексу *(малюнак 1)*, які экспанаваўся на выставе «Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля» [6, с. 70].

Большасць манет у скарбе з Каралёва Стана (84 экз.) складаюць эмісіі Рэчы Паспалітай, а перадусім – тымфы Яна II Казіміра Вазы (1649–1668), якіх налічваецца 83 адзінкі. Эмісіі Жыгімонта III Вазы (1587–1632) прадстаўлены ўсяго толькі адной манетай – каронным ортам 1621 г. (тып BD21-209) [12].

Сярод тымфаў пераважаюць манеты чаканкі Кракаўскага манетнага двара. Усяго манет гэтага наміналу 83 адзінкі. Сярод іх 28 экз. 1663 г., 20 з якіх належаць Кракаўскаму манетнаму двару, 6 – Быдгашчскаму і 2 манеты – Львоўскаму *(малюнак 2)*. Сярод 19 тымфаў 1664 г. 12 былі адбітыя ў Кракаве і 7 – у Быдгашчы. Наступны 1665 г. у скарбе прадстаўлены 28 манетамі, сярод якіх большасць таксама кракаўскай чаканкі – 17, а астатнія 11 – быдгашчскай. Шэсць тымфаў датуюцца 1666 г., тры з іх адчаканены ў Кракаве і тры – у Быдгашчы. Таксама маюцца дзве манеты з нявызначанымі датай і манетным дваром.

Больш разнастайнай з'яўляецца група манет Заходняй Еўропы – 65 экз. Сярод іх вылучаецца надзвычай рэдкая для Беларусі манета Французскага каралеўства – паўэкю Людовіка XIV (1643–1715), адчаканены ў 1652 г. у Нарбоне *(малюнак 3)*. Па неафіцыйных звестках, французскія талерныя манеты час ад часу сустракаюцца на нашай тэрыторыі, але аўтарам не ўдалося знайсці інфармацыю пра гэта ў даступных публікацыях. Падобныя знаходкі зафіксаваны ў суседніх з Беларуссю рэгіёнах: паўэкю 1652 г. у скарбе з в. Чарнацкае Ноўгарад-Северскага ўезда Чарнігаўскай губерніі, знойдзеным у 1912 г. [9, с. 187, № 135], і экю 1654 г. у скарбе з Urkuvėnai Шаўляйскага раёна Літоўскай ССР [10, с. 166–167].

Пруская чаканка, звычайная для беларускіх дэпазітаў XVII–XVIII стст., прадстаўлена ў захаванай частцы скарбу з Каралёва Стана ўсяго толькі адной манетай – ортам Фрыдрыха Вільгельма (1640–1688), адчаканеным у Кёнігсбергу ў 1684 г. Таксама толькі адна манета належыць да эмісій Свяшчэннай Рымскай імперыі – гэта фларын (28 шцювераў) усходнефрызійскага горада Эмдэн. Гэтая манета датуецца часам праўлення імператара Фердынанда III (1637–1657).

Значную частку ў разглядаемым дэпазіце складаюць нідэрландскія манеты – як Іспанскіх Нідэрландаў, так і Злучаных Правінцый Нідэрландаў. Перавага нідэрландскіх эмісій сярод манет буйных наміналаў – дастаткова звычайная з'ява ў беларускіх скарбах.

Эмісіі Злучаных Правінцый Нідэрландаў прадстаўлены 17 манетамі чатырох наміналаў:

- $^1/_2$ рыксдаальдэра – 1 экз. (Зеландыя, 1623);
- $^1/_2$ зільбердуката – 1 экз. (Утрэхт, 1664);
- зільбердукаты – 6 экз. (Галандыя, 1672 і 16хх; Дэвентэр, 1663; Заходняя Фрызія, 1659 і 1666; Утрэхт, 1694);
- левендаальдэры – 9 экз. (Гельдэрн, 1647 (2) і 1648; Зволе, 1641; Зеландыя, 1652; Кампэн, 1647 і 1648 (2); Утрэхт 1647).

Найбольш шматлікімі сярод заходнееўрапейскіх манет скарбу з Каралёва Стана з'яўляюцца эмісіі Іспанскіх Нідэрландаў. Гэта 43 манеты трох наміналаў, амаль палова з якіх – патагоны *(табліца)*:

- $^1/_4$ патагона – 13 экз.: Брабант, без даты (3); Турнэ, без даты (4); Фландрыя, без даты (4), 1632 і 1644;



*Тымф 1663 г. Ян II Казімір Ваза. Рэч Паспалітая, ман. дв. Львова*

***Малюнак 2***



*Паўэкю 1652 г. Людовік XIV. Францыя, ман. дв. Нарбоны*

***Малюнак 3***

Табліца

**Наміналы і эмітэнты манет Іспанскіх Нідэрландаў са скарбу з Каралёва Стана**

| | Альберт і Ізабэла (1598–1621) | Філіп IV Іспанскі (1621–1665) | Карл II (1665–1700) | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| $^{1}/_{4}$ патагона | 11 | 2 | - | **13** |
| $^{1}/_{2}$ патагона | - | 7 | 2 | **9** |
| Патагон | 4 | 12 | 5 | **21** |
| **Усяго** | **15** | **21** | **7** | **43** |

- $^{1}/_{2}$ патагона – 9 экз.: Брабант, 1635 (2), 1645, 1649, 1677 і 1694; Турнэ, 1623; Фландрыя, 1648 і 1654;
- патагоны – 21 экз.: Артуа, 1623; Брабант, без даты (2), 161х, 1624, 1627, 1636 (2), 1637, 1638, 1651, 1669 і 1673 (2); Бургундзія, 1624; Турнэ, 1654 і 1665; Фландрыя, без даты, 1631, 1672 і 1680.

Сярод гэтых манет звяртае на сябе ўвагу фландрыйскі паўпатагон 1648 г., у якога апошняя цыфра даты перабіта з цыфры «7» *(малюнак 4)*.

У разрабаванай частцы скарбу былі, па неправераных звестках, таксама манеты Даніі, Нідэрландаў, Рэчы Паспалітай. Але, на жаль, гэтая частка скарбу назаўсёды страчана для навукі.

Малодшыя манеты скарбу з вёскі Каралёў Стан датаваны 1694 г. – гэта зільбердукат Утрэхта і брабанцкі паўпатагон *(малюнак 5)*. Адпаведна, тэзаўрацыю гэтага комплексу можна датаваць апошнімі гадамі XVII ст. ці пачаткам XVIII ст.

З улікам таго, што нават захаваная частка скарбу складала даволі значную суму (больш за 46 талераў, 2 орты і 83 тымфы), то можна меркаваць, што грошы належалі дастаткова заможнаму чалавеку. Наўрад ці гэты комплекс можна аднесці да так званых «гандлёвых» скарбаў або да вайсковых кас, пра што сведчыць адсутнасць наміналаў, драбнейшых за орт і тымф. Гэтыя манеты былі, верагодна, назапашаны чалавекам з высокага саслоўя, які загінуў(?) падчас нейкіх падзей. Хаця, вядома, усё можа быць больш празаічна. Уладальнік грошай мог захварэць і раптоўна памерці, не паспеўшы распавесці блізкім пра месца, дзе ён схаваў свае багацце.

Цікава, што прыкладна ў 1695 г. памірае трымальнік маёнтку Волма (у які ўваходзіла вёска Каралёў Стан) Ян Рафал Кастравіцкі. Тэарэтычна, схаваныя ў Каралёвым Стане манеты маглі належаць менавіта яму, але яго смерць, верагодна, не была раптоўнай, і ён паспеў бы перадаць звесткі аб гэтым багацці сваім нашчадкам.

Наступны трымальнік Волмы Антоні Кастравіцкі ў канцы XVII ст. – пачатку XVIII ст. меў памежны канфлікт з уніяцкім мітрапалітам Леанам Шлюбічам-Заленскім, супраць якога нават вёў працэс аб межах [5, арк. 139 адв.; 6, с. 73]. Але наўрад ці гэты канфлікт, які быў дастаткова звычайнай справай, мог прывесці да «выпадзення» скарбу.

У сям'і Кастравіцкіх існавалі і ўнутраныя спрэчкі аб трыманні Волмы. Так, у 1712 г. Антоні Кастравіцкі атрымаў позву ў суд ад свайго кузэна, пляменніка Яна Рафала, Дамініка Кастравіцкага па справе аб правах на маёнтак Волма [4, арк. 245]. Ці мог гэты канфлікт прымусіць уладальніка схаваць багацце, сказаць таксама складана, а далейшыя здагадкі на гэты конт могуць прывесці да дэтэктыўнай гісторыі.

З іншага боку, можна меркаваць, што «выпадзенне» вялікай сукупнасці буйных манет магло быць вынікам нейкіх катастрафічных для Міншчыны падзей. Найбліжэйшыя па часе падзеі адбыліся



*Паўпатагон 1648 г. Філіп IV. Іспанскія Нідэрланды, Фландрыя*

***Малюнак 4***



*а)*



*б)*

*Малодшыя манеты скарбу з Каралёва Стана: а) зільбердукат 1694 г. Злучаныя Правінцыі Нідэрландаў, Утрэхт; б) паўпатагон 1694 г. Карл II. Іспанскія Нідэрланды, Брабант*

***Малюнак 5***

ўжо ў пачатку XVIII ст., падчас Паўночнай вайны. Радзівілы, якім належыла вёска Каралёў Стан, былі палітычнымі супрацiўнікамі Карла XII (1697–1718), і скарб мог быць схаваны ў сувязі з гэтымі абставінамі. Аднак з чэрвеня 1706 г., пасля захопу і разрабавання шматлікай маёмасці Радзівілаў, у тым ліку Нясвіжа (вясной 1706 г.), Караль Радзівіл перайшоў на бок шведаў [8, с. 102]. Але, як было адзначана вышэй, рэальнымі трымальнікамі Каралёва Стана з канца 1670-х гг. былі Кастравіцкія, а пра іх удзел у бурлівых падзеях першага дзесяцігоддзя XVIII ст. нам амаль нічога не вядома.

Найбольш блізка да Каралёва Стана ваенныя падзеі Вялікай Паўночнай вайны наблізіліся ў 1708 г. З 18 сакавіка па 6 чэрвеня 1708 г. войскі Карла XII стаялі ў Радашковічах, пасля чаго армія рушыла праз Гарадок на Менск. У горад шведы ўвайшлі 8 чэрвеня 1708 г. Далей армія шведскага караля рушыла праз Смілавічы і Ігумен і выйшла да расійскага войска пад Галоўчынам, дзе 3–4 ліпеня адбылася значная бітва, якая скончылася перамогай Карла XII.

Такім чынам, амаль месяц шведскія войскі знаходзіліся ў ваколіцах Мінска. Вёска Каралёў Стан размяшчаецца на адлегласці каля 20 км ад цэнтра сталіцы сучаснай Беларусі. Ужо ў Радашковічах шведская армія адчула недахоп правіянту. Гэта вымусіла войскі Карла XII перайсці да татальнай канфіскацыі прадуктаў харчавання, што адштурхнула ад ідэі падтрымкі шведаў вялікую колькасць як шляхты, так і простага насельніцтва Беларусі [8, с. 105]. Засцерагаючыся ад магчымага рабаўніцтва атрадамі фуражыраў, уладальнік скарбу мог схаваць гэткую значную колькасць грошай, аднак вярнуцца па іх не здолеў.

***Бібліяграфічны спіс:***

*1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 814.*

*2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 694. Воп. 7. Спр. 934.*

*3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1515.*

*4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32а.*

*5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 694. Воп. 7. Спр. 934.*

*6. Крыцук, Р.І. Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля: каталог выставы / Р.І. Крыцук, В.М. Сідаровіч, Л.І. Талкачова // Нацыянальны гістарычны музей Рэсп. Беларусь. – Мінск: Кнігазбор, 2018. – 105 с.*

*7. Дело подсудка Минского воеводства Антония Костровицкого с митрополитом Леоном Заленским о захвате последним владений первого от имения Волма. П., 08.10.1699, д. 1062, 12 л. // Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы па гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі»: даведнік; склад. С.І. Паўловіч, Т.М. Мальцава. – Мінск – Полацк, 1999. – С. 73.*

*8. Катлярчук, А. Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў / А. Катлярчук. – Мінск: Выдавецтва «Энцыклапедыкс», 2002. – 296 с.*

*9. Рябцевич, В.Н. Монетные клады XVII и первой четверти XVIII в. на территории Чернигово-Северской земли и Восточной Белоруссии / В.Н. Рябцевич // Нумизматика и сфрагистика. – 1963. – № 1. – С. 152–202.*

*10. Mikołajczyk, A. Skarby monet z XVI, XVII i XVIII wieku zanotowane na bylym obszarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. Materiały do inwentaryzacij / A. Mikołajczyk // Prace i materialy Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi. Seria numizmatyczna i konserwatorska. – Łódz, 1985. – № 5. – S. 129–196.*

*11. Neumann, E. Brandenburg – preußische Münzprägungen unter der Herrschaft der Hohenzollern. 1415–1918 / E. Neumann. – Köln: Münzzentrum Verlag, 1997–1998. – Band 1: Die Münzen des Kurfürstentums Brandenburg unter der Herrschaft der Hohenzollern 1415–1701. – 1997. – 474 p.*

*12. Shatalin, I. Orts of Sigismund III Vasa and Orts of Gustav Adolf, Orts of Georg Wilhelm / I. Shatalin. – 2017. – 147 p.*

*13. Szłapińskij, W. Monety koronne Jana Kazimierza, bite w mennicach zarządzanych przez Andrzeja I Tomasza Tymfów w latach 1662–1667 (przypisanie do poszczególnych mennic) / W. Szłapińskij, S. Bielopolskij. – Lwów: Коло, 2003. – 86 s.*

# Witness of the Northern War: a Treasure from the Village of Karalev Stan, Minsk District

**Vital SIDAROVICH,** *the Belarusian State University, Head of Educational Laboratory of Museum Studies, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: wital.sidarowicz@gmail.com.*

**Luda TOLKACHEVA,** *State Institution "National Historical Museum of the Republic of Belarus", Leading Research Scientist of the Department of Written and Figurative Sources, Candidate of Art History, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: gwendolin@yandex.by.*

**Abstract.** *The article is devoted to the analysis of the treasure from the collection of the National Historical Museum of the Republic of Belarus, which was found in the village of Karalev Stan, Minsk district in 1978. The authors clarified the attribution and prepared statistics of this interesting and attractive complex, the hoarding of which they date back to the last years of the XVII century - the beginning of the XVIII century. Today it is known that in the 1990s the "treasure hunters" found another part of this hoard, not revealed in the initial survey. The number of coins found is unknown, but we can talk about dozens, among which were definitely thalers. The coins have not been studied and have been distributed in private collections, making it impossible for scientists to perform a full analysis of this complex.*